Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 3 (45) 2006

Репозиторий БГПУ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**М. І. МІНЦКІ** — галоўны рэдактар, *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ** — першы намеснік галоўнага рэдактара, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА** — намеснік галоўнага рэдактара, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА** — адказны сакратар
**І. І. БАГДАНОВІЧ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ**, *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН**, *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА**, *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

**У. В. ТУГАЙ** — старшыня
**М. М. ЗАБАЎСКІ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА**, *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН**, *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН**, *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**Установа «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

220004, г. Мінск, вул. Караля, 16; тэл.: 200-02-28 (адк. сакратар),
200-10-73 (аддзел маркетынгу), факс: 200-54-10
e-mail: aiv@aiv.by, http:/www.aiv.by

9 (476) +БПЧ



# ЭКАНАМІЧНЫ АСПЕКТ ЭВАЛЮЦЫІ ВЫХАВАЎЧА-АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПЕРШАБЫТНАСЦІ

***Віктар Пілецкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ імя Максіма Танка***

***Эканоміка адыгрывае важную ролю ў жыцці грамадства. Артыкул асвятляе месца эканамічнай сферы ў накапленні і перадачы сацыяльна значнага вопыту дзецям на стадыі першабытнасці падчас іх пераходу ў дарослае жыццё. Матэрыял будзе каштоўны для паглыбленага вывучэння гісторыі Беларусі, арганізацыі спецкурсаў і спецсемінараў у гімназіях і каледжах.***

Репозиторий БГПУ

Наяўнасць і выключная важнасць выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў эвалюцыі насельніцтва перыяду першабытнага ладу на тэрыторыі Беларусі сёння ўжо не выклікае сумнення ў навуковай грамадскасці краіны. Па гэтай праблеме ёсць публікацыі, асобныя звесткі з выхаваўча-адукацыйнай практыкі трапляюць у падручнікі па гісторыі грамадства. Разам з тым нельга сказаць, што да сённяшніх дзён разгледжаны ўсе асаблівасці выхавання і адукацыі (назапашвання і перадачы вопыту) дзяцей падчас першабытнасці.

Адзін з важных аспектаў эвалюцыі працэсу назапашвання і трансляцыі выхаваўча-адукацыйных ведаў звязаны з эканомікай найстаражытнейшага чалавека. Менавіта эканоміка — гэта тая сфера, дзе ён быў найбольш безабаронны перад прыродай, дзе на карту былі пастаўлены жыццё, магчымасць існавання і развіцця чалавечай супольнасці. Знікненне з гістарычнай арэны неандэртальцаў каля 40–35 тысячагоддзяў назад (праблемы пошуку іх генетычнай сувязі з краманьёнцамі), мноства іншых «разрываў» адзінай эвалюцыйнай тэорыі Дарвіна [1], якія да сённяшніх дзён актывізуюць навуковыя пошукі як прыхільнікаў гэтай важнай канцэпцыі, так і антыдарвіністаў [2, с. 9] — амаль усе яны маюць эканамічную падаплёку ў гісторыі.

Многае ў жыцці першабытнага грамадства залежала ад умення арганізаваць эканамічна-здабытковы працэс, а таксама сацыяльныя адносіны, назапашванне і перадачу вопыту так, каб забеспячэнне найважнейшых умоў грамадскага выжывання дазволіла захаваць гістарычную перспектыву і грамадска-ўзнаўляючы рух наперад. Сярод іх — бесперабойнае харчаванне, абарона ад холаду ва ўмовах прыледніковай паласы (якой была на той час тэрыторыя Беларусі), барацьба з дзікім жывёльным светам і з непазнаным прыродным асяроддзем, вынаходніцтва спосабаў лячэння ад хвароб і інш. Выжывальнасць грамадства была адной з найважнейшых праблем, што вырашалася эканомікай, а таму яна не магла не адлюстравацца ў выхаваўча-адукацыйным працэсе. Змест вопыту, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне, уключаў у сябе перш за ўсё эканамічныя веды. Менавіта эканоміка напрамую ўплывала на выжывальнасць, а значыць, уменні і навыкі, здабытыя грамадствам падчас эканамічнай дзейнасці, павінны былі ў першую чаргу перадавацца падрастаючым пакаленням. Ад паўнаты перадачы ўменняў і спосабаў эканамічных дзеянняў залежала не толькі забяспечаная старасць старэйшых пакаленняў, але і паспяховая будучыня ўсяго грамадства.

Увогуле, першабытна-абшчынны лад — гэта своеасаблівы перыяд чалавечай гісторыі, у які закладваліся першыя парасткі найважнейшых напрамкаў развіцця гаспадаркі, грамадскіх узаемаад-

носін і культуры чалавецтва, тых, што развіваюцца да сённяшніх дзён. Менавіта тады ўзніклі прылады і сродкі працы, зарадзіліся асноўныя віды сельскагаспадарчай дзейнасці: паляванне, рыбалоўства, земляробства і жывёлагадоўля. Былі вынайдзены адзенне і жыллё, транспарт і рамяство, здабыванне агню і металургія [3, с. 94]. Арганізавана першая вытворчасць штучных матэрыялаў і металаапрацоўка. У той час ішло актыўнае развіццё мовы і мыслення, складвалася сістэма абрадаў, звычаяў і рытуалаў, зарадзілася выяўленчае мастацтва і музыка, афармілася звычаёвае права. Узніклі зачаткі рэлігіі і навукі, пачалі фарміравацца грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны.

Назапашаны першабытным насельніцтвам выхаваўча-адукацыйны вопыт перадаваўся дзецям. Гэта з'яўляецца відавочным прагрэсам у паляпшэнні ўмоў грамадскага існавання на тэрыторыі Беларусі. Кожная новая археалагічная эпоха (палеаліт, мезаліт, неаліт, бронзавы і жалезны вякі) сведчыць пра выключныя дасягненні чалавецтва ў эканамічнай сферы, якія, безумоўна, не маглі быць ажыццёўлены без паспяховага назапашвання і сталых метадаў і формаў перадачы вопыту новым пакаленням людзей.

Неандэрталец, найстаражытнейшы жыхар тэрыторыі Беларусі, ствараў прымітыўныя каменныя прылады [4]. Але ў той жа час методыка іх выканання (тэхніка эпохі мусцье [5, с. 40]), у параўнанні з папярэднім этапам (шэльска-ашэльскай эпохамі, часам пражывання архантрапа) [6] адрознівалася надзвычай высокім узроўнем мэтанакіраванасці стваральніка. Навукоўцы адзначаюць, што тагачасныя майстры, каб выканаць патрэбную прыладу, павінны былі ажыццявіць тры асобныя віды дзейнасці, што сведчыць пра наяўнасць вытворчага мыслення, якое адсутнічала ў жывёльных продкаў чалавека нават на самай высокай стадыі іх эвалюцыі [7]. Неандэрталец працаваў на калектыў суродзічаў, пра што сведчаць знаходкі харчовых ям. Акрамя гэтага, на стадыі эвалюцыі першага жыхара тэрыторыі Беларусі існаваў першапачатковы падзел працы паводле полу і ўзросту, а «фарміравалася абстрактнае мысленне, зараджаліся мастацтва і грамадская свядомасць» [8, с. 461].

Чаргаванне эпох рэзкіх пахаладанняў і пацяпленняў з'яўлялася своеасаблівым стымулам для развіцця і ўдасканалення прылад працы [9]. Яно садзейнічала актыўнаму ўзнікненню новых патрэб чалавека (напрыклад, у пабудове жылля, вопратцы, гарачай ежы і інш.), што спрыяла зараджэнню новых галін працы і відаў дзейнасці. Позні палеаліт, у параўнанні з папярэднімі археалагічнымі эпохамі ў гісторыі першабытнага насельніцтва тэрыторыі Беларусі, дае прыклады доўгатэрміновых стаянак старажытных людзей [10]. Тут прадстаўлены прымітыўныя жыллёвыя пабудовы, што падкрэслівае новую прыступку эвалюцыі [11]. Новы этап развіцця жыццядзейнасці абавязкова прыводзіў да пашырэння грамадска значнага вопыту, перадача якога на кожным новым вітку ўзнаўлення чалавецтва расла ў геаметрычнай прагрэсіі. Новае пакаленне нарошчвала грамадска неабходны вопыт, які атрымала ад бацькоў і перадавала дзецям. Адпаведна павялічваўся змест выхаваўча-адукацыйнага працэсу і ўдасканальваліся спосабы яго перадачы.

Гістарычна першы этап пражывання чалавецтва на тэрыторыі нашай краіны азнаменаваны прысвойваючай гаспадаркай, развіццё якой прыпадае на эпохі палеаліту і мезаліту. Аснову гаспадарчага жыцця ў гэты час складалі збіральніцтва, паляванне і рыбалоўства. Кожны з гэтых відаў дзейнасці быў па-свойму значны для выжывання тагачаснага чалавека.

Збіральніцтва было самым старажытным тыпам эканамічнай дзейнасці. Яно не патрабавала складаных прылад працы або прыстасаванняў. Людзі збіралі ўсё тое, што можна было з'есці: насенне злакаў, арэхі, жалуды, карэньчыкі і сцёблы раслін. Ужываліся і прадукты жывёльнага паходжання: жабы, яшчаркі, дробныя грызуны, рачныя і азёрныя малюскі, мёд, птушыныя яйкі і інш. Пры гэтым першабытны збіральнік павінен быў валодаць пэўнымі ведамі і навыкамі, напрыклад, пра ядавітыя ці лекавыя расліны. Ён ацэньваў на прыдатнасць для харчавання тыя ці іншыя

Рэпазіторый БДПУ

прадукты жывёльнага паходжання, ведаў месцы рассялення грызуноў і земнаводных, іх звычкі, смакавыя, лекавыя, атручвальныя і іншыя якасці збіраемых раслін. Відавочна, што без атрымання гэтых спецыфічных ведаў ад старэйшых падлеткі не маглі эфектыўна займацца сацыяльна важнай збіральніцкай працай.

Паляванне давала чалавеку перш за ўсё высокакаларыйны прадукт харчавання — мяса, а таксама скуру для вырабу адзення, косці (самы распаўсюджаны матэрыял для пабудовы жылля або для стварэння прылад працы і прыстасаванняў) і многае іншае [12, с. 23]. Загоннае паляванне, акрамя сказанага, яшчэ і развівала мысленне першабытнага чалавека, яго моўныя магчымасці, уменне ўступаць у калектыўныя дзеянні з супляменнікамі, інакш кажучы, рабіла яго грамадскім індывідам [13, с. 8].

Важным заняткам было рыбалоўства, дзякуючы якому чалавецтва атрымала магчымасць не толькі валавога павелічэння харчовых запасаў, але і прывыкло да ўжывання ў ежу надзвычай карысных для арганізма, багатых на фосфар морапрадуктаў [14]. Развіццё працэсу вынаходніцтва рыбалоўных прыстасаванняў праз пляценне людзьмі сетак стала стымулам да ткацтва. Яно, у сваю чаргу, было перадумовай да вытворчасці адзення, а гэта значыць, з'явілася магчымасць для асваення новых тэрыторый з халодным прыледніковым кліматам.

Перадача вопыту на стадыі прысвойваючай гаспадаркі мела свае асаблівасці, абумоўленыя ўзроўнем развіцця чалавека і грамадства. Найважнейшай сярод іх была рытуальна-стэрэатыпная сутнасць набыцця ведаў і навыкаў. Пры ёй навучаннем і выхаваннем (трансляцыяй вопыту) ахопліваліся адначасова і дзеці, і дарослыя падчас удзелу ў агульнародавых абрадавых дзеяннях [15, с. 130]. Аснову зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу той пары складалі здабыткова-эканамічныя веды, якімі валодаў старажытны збіральнік, паляўнічы або рыбалоў. Не менш важнымі ў працэсе перадачы вопыту новым пакаленням былі і веды сацыяльна-ўзаемаадносіннага характару: абрады, міфалогія, рэлігія, астралагічныя звесткі і інш. [16]. Але на першым месцы заўсёды стаяў эканамічна-здабытковы вопыт, ад назапашвання якога напрамую залежала выжывальнасць грамадства.

Інтэлектуальная перавага чалавека над жывёламі, здольнасць да перайманння і назапашвання вопыту ад старэйшы дазволілі яму выпрацаваць даволі даска налыя сродкі, формы і тэхналагічны прыёмы па збіранні раслінай ежы здабычы звера, птушкі і рыбы. Гэта за бяспечыла яму больш надзейныя і эфек тыўныя крыніцы харчавання, дапамаглі зрабіць важны крок на шляху ад пры свойваючай да вытворчай гаспадаркі [17 с. 43].

Эпоха вытворчага ладу жыцця чала вецтва ўзнікла ў X–VI тысячагоддзях н Блізкім Усходзе і ў Сярэдняй Азі У гісторыі Беларусі храналагічнай мя жой паміж прысвойваючай гаспадарка і вытворчасцю з'яўляецца канец III – пачатак II тысячагоддзя да н. э. Пер шымі жывёламі, прыручанымі жыхара ў старажытнасці, былі сабака (прыкла на ў IX тыс. да н. э.), а затым свін і бык. Раней за іншых да жывёлага доўлі пачалі пераходзіць жыхары Пале кага рэгіёна (у III тыс. да н. э.), чам ў значнай ступені спрыяла міграцы жывёлагадоўчых плямён, што прыбы з поўдня і захаду на тэрыторыю Бел русі. Раскопкі стаянкі Камень Пінска раёна, што належала да нёманскай а хеалагічнай культуры, далі прыклад знаходак найбольш ранніх сведчання жывёлагадоўчай практыкі насельніцт [18]. У эпоху бронзы жывёлагадоўл становіцца ўжо вядучай галіной гасп даркі для ўсіх жыхароў сучаснай Бел русі. Большасць астэалагічных матэры лаў, здабытых беларускімі археолагам належыць буйной рагатай жывёле, ш сведчыць аб яе найбольшай распаўс джанасці пры архаічнай жывёлагадоўл У першай палове I тысячагоддзя да н. хатняя жывёлагадоўля паўсюдна пера жала над паляваннем і яе роля пас пова павялічвалася.

Догляд жывёлы, яе кармленне ўтрыманне, развядзенне, выкарыстан для харчавання і перапрацоўка жывёл гадоўчай прадукцыі (малако, мя тлушч, косці, скура) — усё гэта патр бавала значнай колькасці ўменняў і н выкаў, якія чалавецтва назапашвала н

Рэпазіторый БДПУ

калькі тысячагоддзяў. Вопыт арганізацыі жывёлагадоўчай справы збіраўся па крупінках, кожнае новае пакаленне дапаўняла і ўдасканальвала яго, а затым перадавала новым пакаленням. Людзі даражылі ведамі і ўменнямі, якія стваралі ўмовы для выжывання, бо ад гэтага залежала будучыня грамадства.

Сведчанні ранняга земляробства на поўдні Беларусі адносяцца да сярэдзіны V тысячагоддзя да н. э., а бясспрэчныя факты існавання гэтай галіны гаспадаркі — да эпохі бронзы [19]. Пачатковае земляробства існавала ў прымітыўнай падсечна-агнявой форме. Вялікае значэнне пры гэтай сістэме мелі сякера і агонь. Праца земляроба пачыналася з выбару месца падсекі. Спачатку на дрэве выдалялі частку кары, потым яго падразалі. Дрэвы засыхалі на пні, затым іх спальвалі і апрацоўвалі ўгноеную попелам зямлю пад пасевы [20]. Прымяненне сякеры з драўлянай ручкай дазволіла рабіць суцэльныя высечкі сырога лесу, што значна паскарала працэс распрацоўкі плошчаў пад сельгасугоддзі.

З развіццём земляробства чалавек аказаўся ў якасна новых умовах жыцця ў параўнанні з існаваннем збіральнікаў, паляўнічых і рыбаловаў. Гэта садзейнічала глыбокім сацыяльна-псіхалагічным зменам у самім чалавеку, сур'ёзнай трансфармацыі падлягаў грамадскі выхаваўча-адукацыйны працэс. Змест вопыту, што перадаваўся новым пакаленням, аказаўся неймаверна пашыраным, бо нават падсечна-агнявая прасцейшая сістэма патрабавала ведання мноства новых формаў працы, уменняў і навыкаў. Дарослы сацыяльна-адказны грамадзянін, спецыяліст, які займаўся тагачаснай формай земляробства, павінен быў валодаць аперацыямі, да якіх адносіліся: 1) выбар ляснога ўчастка; 2) яго падсека; 3) спальванне; 4) рыхленне зямлі; 5) пасеў зярнят або пасадка караняплодаў; 6) догляд пасеваў (барацьба з пустазеллем); 7) ахова ад звяроў і птушак; 8) збор ураджаю; 9) малацьба і ачышчэнне зерня; 10) пабудова збожжасховішчаў; 11) памол зерня; 12) выпечка хлеба; 13) якасны і колькасны адбор і зберажэнне насеннага матэрыялу.

Наступны этап эвалюцыі земляробства патрабаваў яшчэ больш дасканалых і разнастайных формаў дзейнасці. Пра гэта сведчаць археалагічныя знаходкі на беларускіх землях ворыўных прылад разам з доказамі падсечна-агнявой сістэмы земляробства [21]. Ворыўная земляробчая гаспадарка прынесла новыя веды, якія таксама падлягалі перадачы новым пакаленням. Вядома, пераход ад падсекі да ворыўнага земляробства адбыўся не адразу. Гэтаму папярэднічала вялікая работа па вынаходніцтве адпаведных кожнаму з пералічаных цыклаў прылад, а таксама назапашванні новых спецыяльных ведаў. Усё гэта не абыходзілася без удзелу выхаваўча-адукацыйнага працэсу. Менавіта падчас перадачы вопыту дзецям адбывалася грунтоўная сістэматызацыя і класіфікацыя ведаў, назапашаных старэйшымі пакаленнямі, што спрыяла як больш дасканалай трансляцыі ведаў у будучыя пакаленні, так і больш глыбокаму ўсведамленню дасягнутага ў імя далейшага развіцця і ўдасканалення.

Пераход да вытворчых формаў гаспадаркі спрыяў пашырэнню спосабаў атрымання ежы, яна стала больш разнастайнай і якаснай. Менавіта з таго часу ў насельніцтва з'явіўся прыбавачны прадукт, што вяло да пашырэння абмену і грамадскіх сувязей, забяспечыла чалавеку неабходны вольны час для авалодання новым спосабам гаспадарання. З'явілася магчымасць вызваліць ад здабытковага працэсу пэўную колькасць людзей (галоўным чынам старэйшага ўзросту), якія займаліся сістэматызацыяй ведаў і навыкаў, распрацоўкай абраднасці і перадачай вопыту падрастаючаму пакаленню. Гэтыя функцыі падчас разлажэння родавых адносін часцей за ўсё аказваліся ў руках прадстаўнікоў мужчынскіх тайных саюзаў [22].

Падчас разлажэння першабытнаабшчыннага ладу тайныя саюзы мелі разнастайныя функцыі. Сярод іх былі нават палітычныя, што спрыялі разбурэнню мацярынскай арганізацыі грамадства і зацвярджэнню патрыярхальных адносін у тагачасным соцыуме. Пра гэта сведчаць шматлікія публікацыі як айчынных, так і замежных навукоўцаў [23]. Але важнейшай з іх, дзякуючы якой яны і змаглі набыць выключнае тайнасакральнае палажэнне ў постпершабыт-

Репозиторий БГПУ

ным грамадстве, што дало ім магчымасць здабыць вызвалены ад здабыткова-накапляльнай працы статус, была функцыя падрыхтоўкі юнакоў да ўзроставых ініцыяцый [24]. Менавіта ўдзел у ініцыяцыйна-пасвячальнай абраднасці дазволіў мужчынскім супольнасцям кантраляваць найважнейшыя сферы жыцця абшчыны і паступова ператварыцца ў прывілеяванае саслоўе нованароджанага класавага грамадства.

З'яўленне спецыяльных людзей, што ажыццяўлялі працэс перадачы вопыту маладому пакаленню, значна пашырыла і паглыбіла старажытную ініцыяцыйную абраднасць. Фактычна на эканамічна-вытворчай стадыі эвалюцыі грамадства тэрыторыі Беларусі яна заняла месца абавязковай формы інспектавання і сацыяльнага кантролю за працэсам сталення падлеткаў. Выхаваўча-адукацыйны працэс у гэты час набыў грамадскі характар. Пры ім грамадства цалкам рабілася нашмат больш зацікаўленым удзельнікам выхавання і адукацыі дзяцей, чым іх родныя (крэўныя) бацькі. Паступова склаліся і спецыяльныя формы падрыхтоўкі дзяцей, дзе падрастаючае пакаленне набывала веды, навыкі, уменні і выхаваўча-адукацыйныя якасці, патрэбныя ім для паўнапраўнага ўступлення ў дарослы, сацыяльна адказны перыяд жыцця чалавека.

Эвалюцыя грамадскага выхаваўча-адукацыйнага працэсу (перадачы вопыту) на тэрыторыі Беларусі, як бачна з вышэйпрыведзенага матэрыялу, ад самага пачатку яго ўзнікнення (генезісу), абумоўленага з'яўленнем найстаражытнейшых людзей і іх сацыялізацыяй, была цесна звязана з развіццём эканомікі. Менавіта здабыткова-эканамічная сфера, ад якой залежала выжыванне першабытнага грамадства, была тым першачарговым стымулам, што рухаў наперад выхаванне і адукацыю падрастаючага пакалення. Гэта было актуальна ў найстаражытнейшы перыяд падчас пражывання неандэртальца, з-за гэтага фактычна ішла эвалюцыя перадачы вопыту ў збіральніцка-прысвойваючы перыяд, а таксама падчас развіцця вытворчай гаспадаркі. Эканоміка з'яўляецца стымулам эвалюцыі выхаваўча-адукацыйнай практыкі і ў сучасным грамадстве, што сведчыць пра пэўную гістарычную заканамернасць.

Падводзячы вынік сказанаму, можна адзначыць наступнае:

1. Эканамічная сфера жыцця першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі была напрамую звязана з генезісам і першапачатковай эвалюцыяй выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

2. Перадача сацыяльна значнага вопыту, якая была асновай з'явы, названай тэрмінам *выхаваўча-адукацыйны працэс*, мела на мэце пазнаёміць новыя пакаленні людзей перш за ўсё з уменнямі і навыкамі эканамічнага характару, бо ад іх трансляцыі (перадачы) напрамую залежала гістарычнае выжыванне соцыуму і паспяховая эвалюцыя чалавецтва.

3. Ажыццяўленне выхаваўча-адукацыйнага працэсу (перадачы вопыту) на збіральніцка-прысвойваючай стадыі развіцця эканомікі першабытнага грамадства мела спецыфічную рытуальна-стэрэатыпную форму, пры якой навучаннем і выхаваннем (трансляцыяй вопыту) ахопліваліся як дзеці, так і дарослыя падчас удзелу ў агульнародавых абрадавых дзеяннях.

4. Эпоха вытворчага ладу жыцця першабытнага насельніцтва тэрыторыі Беларусі адлюстравалася: а) значным пашырэннем спецыяльнага зместу выхаваўча-адукацыйнага працэсу, які трэба было засвоіць падрастаючаму пакаленню; б) з'яўленнем спецыяльна прызначаных, вызваленых ад здабыткова-накапляльнай грамадскай дзейнасці выхавальнікаў, функцыю якіх выконвалі члены так званых тайных мужчынскіх саюзаў; в) замацаваннем спецыяльнай абраднасці (ініцыяцый), што служыла стымулюючай формай кантролю грамадства за сталеннем падлеткаў; г) грамадска асэнсаванай неабходнасцю падрыхтоўкі падлеткаў да дарослага перыяду жыцця; д) наяўнасцю спецыяльных формаў выхаваўча-адукацыйнай падрыхтоўкі дзяцей.

Рэпазіторый БДПУ

1. *Дарвин, Ч.* Происхождение человека и половой отбор: в 9 т. — М., 1953. — Т. 5.
2. *Владимиров, Д.* Свинья — потомок человека // Аргументы и факты. — 2004. — № 4.
3. *Семенов, С. А.* Развитие техники в каменном веке. — Л., 1968.
4. *Будько, В. Д., Вознячук, Л. Н.* Палеолит Белоруссии и смежных территорий // Древности Белоруссии. — Мн., 1969.
5. *Ксяндзоў, У. П.* Мусцье // БелЭн: у 18 т. — Т. 11. — Мн., 2000.
6. *Урысон, М. И.* Начальные этапы становления человека // У истоков человечества. — М., 1964.
7. *Харитонов, В. М.* Лекции по антропогенезу и археологии палеолита. — М., 1987.
8. *Цягака, Л. І.* Неандэртальцы // Археалогія і нумізматыка: энцыкл. — Мн., 1993.
9. *Калечыц, Е. Г.* Значение находок ископаемой фауны для палеогеографических реконструкций // Беларускія старажытнасці. — Мн., 1972.
10. *Будько, В. Д.* Юревичская верхнепалеолитическая стоянка // Белорусские древности. — Мн., 1967.
11. *Будько, В. Д.* О жилищах Бердыжской палеолитической стоянки // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Института археологии АН СССР. — М., 1964. — Вып. 101.
12. *Абрамова, З. А.* К вопросу об охоте в верхнем палеолите // Сов. археология. — 1964. — № 4.
13. *Семенов, Ю. И.* Возникновение общественных отношений // У истоков человечества. — М., 1964.
14. *Исаенко, В. Ф.* Древнее рыболовство в Полесье // Рыболовство и морской промысел в эпоху раннего металла в лесной и лесостепной зоне Восточной Европы. — Л., 1991.
15. *Пілецкі, В. А.* Генезіс выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі Беларусі. — Мн., 2004.
16. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. — Витебск, 1897.
17. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. — 3-е выд., дап. і перапрац. / В. І. Галубовіч, Р. І. Ермашкевіч, Г. П. Бушчык і інш.; пад рэд. праф. В. І. Галубовіча. — Мн., 1999.
18. *Щеглова, В. В.* Фауна поселения Камень // Беларускія старажытнасці. — Мн., 1972.
19. *Исаенко, В. Ф.* Первые земледельцы и скотоводы Белоруссии // Из истории крестьянства Белоруссии. — Мн., 1978.
20. *Семенов, С. А.* Происхождение земледелия. — Л., 1974.
21. *Поболь, Л. Д.* Древнее рало из торфяника у дер. Каплановичи // Acta Baltico-Slavica. — Bialystok, 1967.
22. *Першиц, А. И.* Тайные союзы // БСЭ: в 30 т. — Т. 25. — М., 1976.
23. *Bittremieux, L.* La société secrète des Bakhimba au Mayombe. — Bruxelles, 1936; *Снесарев, Г. П.* О реликтах мужских союзов в истории народов Средней Азии. — М., 1974; *Пілецкі, В. А.* «Гамераўскія» мужчынскія саюзы як адзін з элементаў фарміравання выхаваўча-адукацыйнага працэсу эпохі антычнасці // Весці БДПУ. — 2004. — № 2.
24. *Токарев, С. А.* Ранние формы религии и их развитие. — М., 1964.


**Мудрость тысячелетий. — М., 2002.**

*Только тот истинно учен, кто хорошо поступает.*

*Ценнейшего клада стократ добродетель ценней, несчастнее нет позабывших о ней.*

Репозиторий БГПУ